# «Берасцейскі кнігазбор», новы праект

У Брэсце прайшла II Міжнародная канферэнцыя «Берасцейскі кнігазбор»

З 1 да 3 чэрвеня ў Брэсце праходзіла II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Берасцейскі кнігазбор: праблемы і перспектывы даследавання».

Адкрыццё канферэнцыі адбылося ў круглай зале Брэсцкага гарвыканкама. З дакладамі і паведамленнямі выступілі дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прэзідэнт Бібліятэчнай асамблеі Еўразіі Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі Алена Іванова, загадчык аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург), прафесар інстытута навуковай інфармацыі і бібліятэказнаўства Вроцлаўскага ўніверсітэта (Польшча) Кшыштаф Мігань, даследчык з Брэста, загадчык кафедры дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Анатоль Гладышчук. У канферэнцыі прымалі ўдзел навукоўцы-бібліятэкары з Расіі, Украіны і нават Казахстана.

Другога чэрвеня ўдзельнікі навуковага мерапрыемства працавалі ў Ружанскім палацавым комплексе Сапегаў. Завяршылася канферэнцыя пасяджэннем савета па здзяйсненню праекта «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Юзафа Крашэўскага». У час навуковага форуму працавала шмат секцый, выстаў, праводзіліся прэзентацыі выданняў. Госці прывезлі ў падарунак абласной бібліятэцы шмат каштоўных кніжных і выдавецкіх рарытэтаў. Таго-сяго няма нават у Нацыянальнай бібліятэцы.

**Иван Орлов**